Международный научно-популярный журнал
Мастерство online
Docendo discimus
Обучая, учимся сами

№3 - 2023

АДКРЫТЫ ВУЧЭБНЫ ЗАНЯТАК ПА ВУЧЭБНАМУ ПРАДМЕТУ «БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА»

В.М. Белавус,
магістр філалагічных навук, выкладчык беларускай мовы і літаратуры вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі Валкавыскага каледжу ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсіітэт імя Янкі Купалы»

Анатацыя. Прапануюцца матэрыялы вучэбнага занятку па вучэбным прадмеце “Беларуская літаратура” па тэме “Змітрок Бядуля. Апавяданне “Бондар” для навучэнцаў спецыяльнасці 2-01 02 01 “Пачатковая адукацыя”. Занятак накіраваны на фарміраванне літаратурнай, камунікатыўнай кампетэнцый, развіццё інтэлектуальных, аналітычных, даследчых, творчых здольнасцей навучэнцаў.

Выкарыстанне прыёмаў актыўнага і інтэрактыўнага навучання, практыкаарыентаваныя заданні, праблемна-пошукавыя пытанні спрыяюць павышэнню пазнавальнай актыўнасці, робяць працэс спасціжэння ведаў больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт навучэнцаў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Ключевые слова: апавяданне “Бондар”, ідэя, праблематыка, сюжэт, тэма мастака і мастацтва, характарыстыка вобраза-персанажа.

Тэма: “Змітрок Бядуля. Апавяданне “Бондар”.

Мэты навучання:

забяспечыць засваенне зместу тэмы, што дазволіць навучэнцам:

на ўзроўні ўяўлення: выказваць агульнае меркаванне аб тэматыцы і праблематыцы твора;

на ўзроўні разумення: апісваць духоўны свет герояў;

на ўзроўні прымянення: аналізаваць апавяданне “Бондар”; характарызаваць вобразы галоўных герояў, даваць ацэнку іх паводзінам.

Мэты развіцця: садзейнічаць удасканаленню навыкаў аналізу мастацкага твора, развіццю камунікатыўных уменняў, пазнавальных і творчых якасцей.

Мэты выхавання: спрыяць выхаванню эмпатыі, асуджэння эстэтычнай неразвітасці, чэрствасці і абыякавасці.

Тып занятку: камбінаваны.

Метадычная мэта: прадэманстраваць выкарыстанне прыёмаў актыўнага і інтэрактыўнага навучання як сродку павышэння пазнавальнай актыўнасці.

Абсталяванне: партрэт Змітрака Бядулі, эпіграф, карткі з заданнямі, сэрвісы LearningApps, Kahoot!.

№3 - 2023

Ход вучэбнага занятку

І. Арганізацыя навучэнцаў да заняткаў.

26 лістапада адзначаецца Сусветны дзень інфармацыі, які праводзіцца штогод з 1994 года па ініцыятыве Міжнароднай акадэміі інфармацыі. Інфармацыя – галоўная каштоўнасць для кожнага чалавека ў сучасным свеце. Усе ведаюць выраз: “Хто валодае інфармацыяй, той валодае светам”. Спадзяюся, што на занятку вы зможаце ўзняцца на яшчэ адну прыступку на шляху да ведаў, пашырыце свой кругагляд новай інфармацыяй, якая спатрэбіцца вам у будучай прафесійнай дзейнасці. (*Слайд 1*)

ІІ. Тэматызацыя, мэтавызначэнне. Матывацыя.

Прапаную перагарнуць старонку літаратурнага календара (https://ru.calameo.com/read/006039769cc9fc689969b) [1] і ўспомніць чарговага юбіляра – беларускага празаіка, паэта, літаратурнага крытыка, публіцыста, мовазнаўцу, аўтара вядомых вам са школы мастацкіх твораў: “На Каляды к сыну”, “Пяць лыжак заціркі”, “Салавей”. Гэтыя творы вельмі дакладна характарызуюць постаць пісьменніка, яго трапнае, але далікатнае слова, якое прымушае задумацца над чалавечай існасцю. За гэтую рысу крытыкі ахрысцілі Змітрака Бядулю “беларускім салаўём”, а яго лірычныя абразкі і аповесці ўвайшлі ў залаты фонд айчыннай літаратуры. (*Слайд 2*)

Дарэчы, сёлета адзначаецца 135-годдзе з дня нараджэння Змітрака Бядулі, таму мэтазгодна на вучэбным занятку па тэме “Змітрок Бядуля. Апавяданне “Бондар” абагульніць веды пра жыццёвы і творчы шлях мастака слова і актуальнасць праблем, узнятых у яго мастацкім творы.

Праца з эпіграфам. У творы “Дзесяць загадаў для памяці” З. Бядуля напісаў: “Шануй сваю мову, свае песні, свае казкі, звычаі і ўсё роднае – гэта вялікі нацыянальны скарб… Толькі тады чалавек вольны, калі мае ўсё сваё”. (*Слайд 3*)

Што, на погляд пісьменніка, складае нацыянальны скарб беларускага народа?

Што дапамагае нам не страціць нацыянальную спадчыну?

Сапраўды, веданне мовы, звычаяў і традыцый, беларускага фальклору і мастацкай літаратуры, нацыянальнай культуры дапамагае нам захаваць пераемнасць пакаленняў, далучыцца да багатага жыццёвага вопыту беларусаў, да шматграннай духоўнай культуры мудрага народа.

Праблемнае заданне. Зараз я прапаную вам паслухаць прытчу і адказаць на пытанні: Чаму вас навучыла прытча? У чым заключаецца яе мараль? (*Слайд 4*)

Прытча пра мудраца

Жыў-быў на свеце адзін Мудрэц. Ён быў вельмі мудрым, ніколі не памыляўся і ведаў правільны адказ на любое пытанне. А побач жыў Чалавек, які зайздросціў славе Мудраца.

Дык вось, гэты чалавек увесь час думаў, якое пытанне задаць Мудрацу, каб ён не змог на яго адказаць і пасмяяцца з яго. І аднойчы Чалавек злавіў матылька, зацiснуў яго ў кулаку і прыйшоў да Мудраца.

– Скажы мне, Мудрэц, – спытаў ён, –што ў мяне ў руках? Жывое або мёртвае?

Чалавек вырашыў, калі Мудрэц скажа мёртвае, то ён пусціць матылька, калі скажа жывое, то раздавіць матылька ў кулаку.

Мудрэц ўважліва паглядзеў на Чалавека і сказаў:

– Усё ў тваіх руках [5].

Чаму вас навучыла прытча?

У чым заключаецца мараль прытчы?

Толькі сам чалавек – творца свайго шчасця, усё залежыць ад яго самога. А сваё прызначэнне Змітрок Бядуля бачыў не толькі ва ўслаўленні хараства прыроды, а і таго, што ствараецца рукамі таленавітых майстроў.

Прыём “Прагназаванне»”. Спрагназуйце, на якую тэму пойдзе размова на вучэбным занятку. (Магчыма, пра таленавітага чалавека, майстра.)

Тэма занятку: “Змітрок Бядуля. Апавяданне “Бондар”. (*Слайд 5*)

Прапаную сфармуляваць задачы да вучэбнага занятку. (*Слайд 6*)

буду ведаць …

- кароткія звесткі пра жыццёвы і творчы шлях Змітрака Бядулі
- асаблівасці вобраза майстра-працаўніка на аснове зместу апавядання “Бондар”
- мастацкія адметнасці апавядання “Бондар”

буду ўмець…

- рабіць аналіз малых эпічных твораў
- рабіць адбор тэкставай інфармацыі для характарыстыкі герояў

навучуся даваць… / вызначаць…

- вызначаць тэму, ідэю, праблематыку апавядання “Бондар”
- характарызаваць герояў

Жадаю плённай працы для вырашэння пастаўленых задач.

III. Паўтаральна-навучальная работа па пройдзеным матэрыяле.

Апераджальныя заданні

1. Кароткі агляд жыццёвага і творчага шляху Змітрака Бядулі. (*Слайды 7–13*)

2. Заданне для групы. Пошук інфармацыі самага рэдкага факта пра жыццё і творчасць Змітрака Бядулі. Намінацыі: “Самы цікавы музычны факт”, “Самы нeча-

каны біяграфічны факт”, “Самы рэдкі літаратурны факт”, “Самы недапусцімы педагагічны факт”, “Самы ўражваючы рамантычны факт”. (*Слайд 14*)

3. Даследчае заданне было прапанавана па тэме “Літаратурныя псеўданімы Самуіла Плаўніка”. (*Слайды 15–19*)

ЛІТАРАТУРНЫЯ ПСЕЎДАНІМЫ САМУІЛА ПЛАЎНІКА

Кожнаму чалавеку прозвішча даецца ад бацькоў, таму людзі ўспрымаюць і зберагаюць яго як родавую спадчыну, а псеўданімы – выбіраюць. Нялёгка знайсці тое слова з лексічнага запасу, якое перадавала б інтарэсы, мары і выяўляла б сутнасць духоўнай дзейнасці. І калі пры выбары псеўданіма пяшчотна-пякельна затрымцела душа, значыць яна атрымала бласлаўленне навакольнай прасторы і маўклівае прадказанне наконт лёсу, жыццёвага і творчага.

Псеўданімы ў гэтай справе – вельмі прыдатны матэрыял. Ён наглядна і пераканальна дапамагае сцісла, дакладна вызначаць сутнасць і характар творчасці пісьменнікаў. Самымі распаўсюджанымі прычынамі ўзнікнення псеўданімаў з’яўляюцца: цяжкія цэнзурныя ўмовы, жаданне пазбегнуць праследавання, грамадскае становішча аўтара, няўпэўненасць у сваіх сілах, імкненне ўтаіць свой пол, духоўна-культурныя, сацыяльна-палітычныя ўмовы, літаратурныя традыцыі, перакананні, схільнасці, манеры аўтара. Адзначым, што ва ўсе часы і ў розных краінах прычыны ўзнікнення псеўданімаў былі падобнымі.

Разважаючы на гэтую тэму, міжволі задумаешся пра псеўданімы вядомых пісьменнікаў. Чаму беларускія дзеячы культуры бралі сабе іншыя імёны, прозвішчы? Якое сэнсавае значэнне яны нясуць? З гэтых пытанняў пачалося даследаванне “Літаратурныя псеўданімы Самуіла Плаўніка”.

У Самуіла Плаўніка было безліч псеўданімаў: Змітрок Бядуля, Ясакар, Сымон Пустэльнік, Іскра, Святагор, Ярыла Чырвоны, З.Б., Ярыла Паўстанец, Вартавы, Тутэйшы, Вольны, Марыля.

Псеўданім Бядуля быў запазычаны з беларускага фальклорнага падання пра спагадлівага дзядулю Бядулю, які намагаўся накарміць галодных і абяздоленых людзей, і замацаваўся за ім на ўсё жыццё. Псеўданім добра адпавядаў чуллівому, спагадліваму сэрцу пісьменніка. Менавіта пад гэтым псеўданімам быў надрукаваны ў 1910 г. яго абразок “Пяюць начлежнікі…”. Такім чынам, псеўданім падкрэсліваў еднасць пісьменніка з народам. З.Б. – гэта ініцыялы, адпаведныя дадзенаму псеўданіму.

Святагор – асілак з рускіх былін, у якасці псеўданіма асацыіруецца з магутнасцю творчасці.

Ярыла Чырвоны – бог сонца, урадлівасці і кахання. Як псеўданім сведчыць пра плённасць творчасці і абавязковую прысутнасць у ёй тэмы кахання.

Пра рэвалюцыйную скіраванасць творчасці сведчаць псеўданімы Вольны, Ярыла Паўстанец, Вартавы, Іскра.

Вядомы беларускі літаратуразнаўца Іван Навуменка ўдала патлумачыў

іншы псеўданім аўтара – Ясакар: “Ясакар – пірамідальная таполя. Уражанне такое, што дрэва гэтае, нібы страла, ірвецца ў неба. Паэзія Самуіла Плаўніка таксама як бы імкнулася ў паднябессе” [4, с. 139].

Псеўданім Сымон Пустэльнік сведчыць пра задуменнасць творчасці аўтара, паглыбленасць у сабе.

Тутэйшымі доўгі час называлі сябе беларусы, бо словы “Беларусь” і “беларусы” былі забаронены.

Самуіл Плаўнік для найлепшай канспірацыі абіраў нават жаночае імя Марыля.

Такім чынам, у паэта было шмат псеўданімаў, якія выбіраліся ў залежнасці ад абставінаў, яскрава і змястоўна характарызавалі яго літаратурнае крэда.

Заданне для групы. Пад якім псеўданімам выйшла ў свет апавяданне “Бондар”?

4. Выкананне інтэрактыўнага задання “Стужка часу” ў сэрвісе Learningapps (https://learningapps.org/display?v=p4z82is0n21) (дадатак 1). (*Слайд 20*)

IV. Работа па асэнсаванні і засваенні новага матэрыялу.

1. Прагляд відэафрагмента. Праглядзіце відэафрагмент і адкажыце, пра якое рамяство пойдзе размова ў апавяданні? (*Слайд 21*)

Аб чым паведамляе сама назва мастацкага твора?

Дзе і калі было надрукавана апавяданне? Адказ знайдзіце ў падручніку на с. 165.

2. Прэзентацыя экспазіцыі “Вырабы бондарства” віртуальнага музея [3; 6].

Дэманстрацыя на экране прадметаў посуду, тлумачэнне незразумелых слоў. (*Слайды 22–28*)

У віртуальным музеі ў экспазіцыі “Вырабы бондарства” прадстаўлены посуд, які ў сялянскай хаце заўсёды займаў пачэснае месца. Амаль у кожнай вёсцы быў бондар, які вырабляў яго на заказ. Звычайна ж бондарствам займаліся многія гаспадары ў свабодную ад сельскагаспадарчай працы часіну. Але адмысловы посуд атрымліваўся толькі ў майстра. Дзежкі, кадзі, кубельчыкі, каўшы, вёдры – усё гэта і многае іншае вырабляў кожны гаспадар, ці заказваў майстру-бондару. Аб тым, што бандарнае рамяство было шырока распаўсюджана, сведчаць нават прозвішчы: Бандарык, Бандарэц, Бондар.

Звернем увагу на некаторыя вырабы.

Дзежка – драўляная, крыху звужаная к верху пасудзіна з прамых клёпак. Дзежка выкарыстоўвалася для заквашвання цеста, салення.

Кубельцы ўяўлялі сабой малыя кадкі для захоўвання прадуктаў з вушкамі і накрыўкай.

Маслабойка – гэта пасудзіна для збівання масла.

Біклага – гэта невялікая драўляная пасудзіна для вады.

Начоўка – прадаўгаватая драўляная пасудзіна для мыцця бялізны і іншых гаспадарчых патрэб.

Цэбар – гэта шырокая круглая драўляная пасудзіна з клёпак з двума вушкамі.

Ступа – гэта драўляная пасудзіна, у якой таўкуць што-небудзь таўкачом.

Кадка – гэта ёмістасць цыліндрычнай формы, зробленая з драўляных клёпак (дошчачак) і абцягнутая металічнымі або драўлянымі абручамі.

Прадстаўлены драўляны посуд для бытавых патрэб выраблялі з розных парод драўніны. З дубу рабілі вёдры, кубельцы і дзежкі, бочкі і кадкі пад квас, сок, грыбы, агародніну. З сасны найчасцей выраблялі цэбры, кубельцы. З асіны – бочкі пад капусту.

Ці спадабаўся вам мастацкі твор “Бондар”, які вы прачыталі на сённяшні вучэбны занятак? Што прымусіла хвалявацца?

3. Складанне кросэнсу.

Прапаную вам знайсці асацыятыўную сувязь паміж наступнымі малюнкамі і расшыфраваць кросэнс (з англійскай “кросэнс” – гэта перасячэнне сэнсаў). Ваша задача лагічна пабудаваць сувязі па перыметры паміж квадратамі, назваць галоўных герояў, узнавіць сюжэт і сфармуляваць тэму мастацкага твора (дадатак 2). (*Слайд 29*)

4. Павобразны аналіз мастацкага твора. Праца з схемай-апорай (дадатак 3). (*Слайд 30*)

Якім мы бачым галоўнага героя апавядання? Да чаго імкнецца бондар? Зачытайце, як аўтар характарызуе галоўнага героя?

“Стары Даніла славіўся на цэлую ваколіцу сваімі вырабамі: вёдрамі, начоўкамі, цабэркамі і лыжкамі, якія выходзілі з яго рук моцныя, гладкія і вельмі зграбныя. Ён іх прадаваў на ўсіх кірмашах. У яго іх ахвотна куплялі ўсюды, і ён жыў з жонкай прыпяваючы. Дзяцей у іх не было, гарэлкі ён не піў, так што “залатыя рукі”, як казалі аб ім суседзі, кармілі яго даволі шчодра. А “залатыя рукі” не настолькі цікавілі іх гаспадара Данілу тымі залатоўкамі і рублямі, што яны яму давалі, як здатнасцю і кемнасцю.

Мэтай яго жыцця былі не заработкі, а праца сама па сабе, той любімы час працы, які дае праўдзівае шчасце майстру” [2, с. 47].

Чаму Даніла адзінокі, хоць і жыве сярод людзей? Як ставіцца герой да сябе? (Даніла адзінокі, таму што ён не хацеў дзяліцца сваім вопытам, не любіў, калі назіралі за яго працай. Не лічыў, што аднавяскоўцы здольны ацаніць яго майстэрства і багацце душэўнага свету. Бондар высока ацэньваў свае здольнасці, не бычыў сабе канкурэнтаў).

“У яго рабоце ёсць вялікі вопыт. Вопыт набываецца доўгімі гадамі, руплівасцю, цярплівасцю, трываласцю і замілаваннем да сваёй працы” [2, с. 47].

Адшукайце ўрывак, дзе апісваецца, як майстар клапоціцца пра свае інструменты?

“Бондар вострыць інструменты. На першы погляд здаецца, што гэта рэч вельмі простая і звычайная. Але так здаецца людзям, якія нічога цікавага ведаць не хочуць. Шліфоўка інструментаў – рэч і не простая і не звычайная. Трэба ведаць, які брусок – ці цвёрды, ці мяккі, ці гладкі, ці крупчаты – падходзіць да кожнага начыння. Трэба ведаць, як трымаць брусок, колькі разоў і як плюнуць на яго. Трэба цяміць, як шараваць – ці наўскос, ці проста, ці памалу, ці хутка, ці моцна прыціскаць, ці памаленьку, каб было акурат у меру. Кожнае начынне мае свае капрызы, свае вымаганні, якія майстар павінен памятаць, як свае пяць пальцаў. Потым глянец – з глянцам пачынаецца новая, цікавая гісторыя. Крывавым потам плаціць бондар за гэтую гісторыю. Ён патрабуе, каб інструмент блішчэў і пераліваўся ў розныя колеры, як люстэрка, як празрыстая вада. І ён наводзіць глянец. Потым кладзе свае інструменты ў рад на варштат. Бярэцца ўбокі і дзівіцца на іх, як на любых дзяцей. Адыходзіць. Глядзіць здалёк. Расшырыць вочы. Сажмурыць. Зноў падыходзіць. Хіліцца над інструментамі, нібы хоча іх цалаваць. Пачынае на іх дзьмухаць, хукаць. Блеск на сталі атуляецца слоем сівога туману. Потым туман патроху пачынае сыходзіць, напамінае колер перламутра і хутка знікае. І зноў інструменты блішчаць, як неба ў яркі дзень” [2, с. 50–52].

Зачытайце, што прыносіла радасць творчасці?

“І ён песціў у сваім сэрцы агромную радасць творчасці. Ён бы жадаў выказаць вяскоўцам, як трэба кемна вастрыць начынні-інструменты, як трэба разумным вокам выбіраць дрэва на клёпкі, на дны, на начоўкі, як зграбна можна гэтыя пасудзіны рабіць. Ён бы ім апавядаў аб тым, як ён дадумаўся да розных паляпшэнняў у бондарскай рабоце, дзе ён выкрыў сваю форму, свой спосаб. Ён бы паведаміў аб тым, як захопліваюць чалавека нязмерная радасць і шчырае шчасце, калі ён бачыць, што рукі яго твораць адну пекнату.

Шмат аб чым хацеў гаварыць людзям стары бондар, але ён нёс пакуту маўчання з пакорай у сэрцы. Гэта яго мучыла, але ён усё роўна не патрапіў бы выказаць словамі сваіх пачуццяў і сам толькі туманна разумеў прычыны сваіх імкненняў” [2, с. 48–49].

Што Даніла палічыў галоўнай падзеяй свайго жыцця?

“Ім абодвум кружыць галовы вялікае здарэнне: пані пажадала мець у сваёй гаспадарцы хвалёную работу «залатых рук» Данілы” [2, с. 52].

Чаму заказ пані ўскружыў галовы абоім?

“Во хто яго ўрэшце зразумее і ацэніць!

А гэта ўжо не мужыцкага роду асоба, а з таго гатунку людзей, што ўсё ведаюць...

Даніла ззяў. Памаладзеў. Парухавеў. Тое, да чаго ён рваўся ўсё жыццё, само насустрач ідзе. Во каму ён пакажа свой таемны скарб – пані, вялікай пані, з

вялікага двара! Дзеля гэтага варта была безупынная праца дзесяткаў год, пры якой ён рваўся кудысьці, каб адкрыць людзям свой уласны новы свет” [2, с. 52].

Як перададзена ў творы захапленне ад створаных для пані рэчаў?

“Гэта былі не вёдры, не начоўкі, не лыжкі, а дзіўны сон пекных форм. Гэта былі ажыццёўленыя мары Данілавага сэрца. Гэта было тое, дзеля чаго варта і жыць, і пакутваць...

Звычайнае, простае вока бачыла б у гэтых пасудзінах звычайныя і простыя рэчы. Звычайнае вока лічыла б дзяцінствам урачыстае свята Данілавага сэрца. Звычайнае вока часта глядзіць на золата і думае, што гэта камень. Звычайнае вока не захапляецца парывамі вялікай душы, не блішчыць агнём шчырага падзякавання вялікаму майстру.

У пані з двара незвычайнае вока. Яна ўгледзіць дарагі скарб там, дзе ён папраўдзе ёсць” [2, с. 53–54].

Да чаго прывяло горкае расчараванне майстра?

Душэўныя пакуты, расчараванне героя праз недаацэнку яго майстэрства апісвае аўтар: “Пані, сама гэтага не разумеючы, бязлітасна плюнула чалавеку ў самую душу, зрабіла яму такую рану, якая ніколі не загоіцца. Крыўда была бязмежна балючая, неспадзяваная, хацелася яму валасы сівыя рваць на галаве і выць. Яго скінулі з гары ў глыбокую яму” [2, с. 56].

За што ў адказе кожны чалавек? Сфармулюйце праблему, якая асэнсоўваееца аўтарам. (Праблема адказнасці чалавека за свае ўчынкі.)

Работа ў групах. Цытатная характарыстыка “Сувязь вобраза Данілы з іншымі персанажамі”. Пракаменціруйце, якія адносіны звязваюць герояў, пацвердзіце высновы цытатамі з мастацкага тэксту.

1 група. Якія ўзаемаадносіны ў Данілы з жонкай Аўдоццяй?

2 група. Як адносіцца Даніла да аднавяскоўцаў?

3 група. Як адносіцца Даніла да сваёй працы?

Прэзентацыя адказаў.

Як адносіцца аўтар да Данілы? (Спачувае свайму герою і папракае яго. Нельга трымаць таямніцы майстэрства пры сабе, Даніла нікому не перадаў талент сваіх залатых рук і чулага хараства душы.)

Ці асуджаюць Данілу суседзі? Знайдзіце ў тэксце і зачытайце радкі, у якіх гучыць маральнае асуджэнне эгаізму Данілы. Ці згодны вы з імі і чаму?

“Калі б каго-колечы з нашых Даніла навучыў, той добрым словам успамінаў бы, як бацьку роднага шанаваў. А то ад пані з двара пахвальбы чакаў. Не туды заехаў!” [2, с. 57].

Якую праблему ўздымае пісьменнік? (Праблема непаразумення бондара і аднавяскоўцаў.)

Метадычны прыём “Аднаві паслядоўнасць”. Псіхалагічная схема вобраза галоўнага героя: спадзяванне – натхненне – чаканне – горкае расчараванне – адчай.

У чым, на вашу думку, крыецца філасофскі падтэкст мастацкага твора? (Самы адораны, таленавіты майстар не павінен ганарліва адасабляцца ад людзей; талент і ўмельства трэба перадаваць іншым людзям; кожнаму неабходна бачыць і цаніць харство жыцця і сваім талентам і працай упрыгожваць свет і жыццё.)

Метадычны прыём “4 з 12”. (*Слайд 31*) Якія надзеі ўскладаў Даніла на пані? (Даніла спадзяваўся, што пані ацэніць багатае духоўнае жыццё майстра, яго імкненне да мастацкай дасканаласці.)

Як адносіцца аўтар да вобраза мясцовай пані? Выберыце 4 рысы характару, якія, на вашу думку, пісьменнік асуджае. Аргументуйце адказ.

эстэтычная неразвітасць	уважлівасць	бессардэчнасць	пагарда
баязлівасць	абыякавасць	гуманнасць	упартасць
чалавечнасць	далікатнасць	чэрствасць	чуласць

Пагарда – презрение, пренебрежение.

Якую праблему закранае пісьменнік? (Праблема класавай няроўнасці, недаацэнка таленту мастака пані).

Якія з прапанаваных станоўчых рыс характару дапамогуць нам пазбегнуць жыццёвай памылкі, дапушчанай пані ў апавяданні «Бондар», не застацца абыякавым не толькі да таленавітых майстроў, але і да людзей, якія знаходзяцца побач з намі?

Спадзяюся, што гэтыя жыццёвыя арыенціры назаўсёды застануцца ў вашай памяці. І імі будзеце кіравацца і зараз, і пасля, і ў сямейных узаемаадносінах, і ў сяброўскіх, і ў прафесійнай дзейнасці.

V. Работа па замацаванні выкладзенага матэрыялу.

1. Работа ў парах. Метадычны прыём “Паняційна-тэрміналагічная карта”.

Аднавіце значэнне літаратуразнаўчых тэрмінаў (разблытайце лагічныя ланцужкі). Пракаменціруйце ўласцівыя твору мастацкія адметнасці.

Псіхалагізм	скрупулёзнае, яскравае выяўленне пісьменнікам унутранага, душэўнага стану вобраза-персанажа
Драматызм	крайняя напружанасць, цяжкасць становішча, абставін
Сцісласць	лаканічнасць, матэрыял выкладзены коратка, у нямногіх словах

Дакажыце, што асноўны сродак стварэння вобраза Данілы – псіхалагізм.

Вызначце пафас мастацкага твора “Бондар” (гераічны, рамантычны, трагічны, гумарыстычны, сатырычны)? (Пафас мастацкага твора трагічны.)

2. Кампазіцыйны аналіз мастацкага твора. Разгледзьце схему, пракаменціруйце яе на прыкладзе вобраза Данілы з апавядання “Бондар”.

Якая кампазіцыйная будова гэтага апавядання? (Пяць частак.)

Якія матывы паводзін Данілы ў кожнай кампазіцыйнай частцы? (Праца для майстра – гэта вялікае задавальненне. Герой марыць пра прызнанне і ацэнку яго таленту. Вырабы бондара – сапраўднае мастацтва. Духоўнае спусташэнне героя адбылося з-за недаацэнкі яго ўмельства.)

СЮЖЭТ				
Экспазіцыя – уступная частка літаратурнага твора, у якой выкладаюцца матывы, што ў іх развіваюцца	**Завязка** – першае сутыкненне супрацьдзейных сіл	**Развіццё дзеяння** – паступовыя дзеянні, якія паглыбляюць, набліжаюць канфлікт	**Кульмінацыя** – момант найвышэйшага напружання ў развіцці дзеяння	**Развязка** – вырашэнне супярэчнасцей

Экспазіцыя – аповед пра сям'ю Данілы і яго драўляныя вырабы, якімі той славіўся ў наваколлі.

Завязка – пані замовіла посуд.

Развіццё дзеяння – апісанне працы бондара.

Кульмінацыя – сцэна ў панскім маёнтку.

Развязка – духоўнае спусташэнне аўтара.

3. Стварэнне кадраплана апавядання З. Бядулі "Бондар", кожны кадр падпішыце сказам, які перадае яго асноўную думку.

1. Радасць творчасці майстра-працаўніка.

2. Рупнасць, цярплівасць, вялікая сіла і вопыт майстра ў стварэнні новых вырабаў.

3. Спадзяванні працаўніка.

4. Верабей-хітрун апаганіў цабэрак.

5. Талент загублены чэрствасцю і абыякавасцю.

Прасачыце, як у паасобных частках выяўляецца агульная ідэйная накіраванасць твора. (Даніла заўзята займаецца любімай справай, праца ў яго залатых руках – сапраўднае мастацтва.)

4. Тлумачэнне сувязей паміж гексамі "Тэма мастака і мастацтва ў творах пісьменнікаў".

Звярніце ўвагу на гексы, размешчаныя на дошцы. Па якім прынцыпе могуць быць аб'яднаны мастацкія творы? (Асэнсоўваецца праблема мастака і мастацтва). Якую назву можна даць цэнтральнаму геску, паводле якога згрупаваны астатнія? (Праблема мастака і мастацтва ў творах пісьменнікаў) (дадатак 4).

5. Прэзентацыя "Юбілейная палічка Змітрака Бядулі для дзяцей". (*Слайды 32–35*)

Сёлета адзначаецца 135-гадовы юбілей з дня нараджэння Змітрака Бядулі. Любімы пісьменнік многіх пакаленняў пісаў мастацкія творы не толькі для дарослых, але і для маленькіх чытачоў. У свой час (1921–1922) ён з'яўляўся рэ-

дактарам часопіса для школьнікаў і малодшых школьнікаў “Зоркі”, аўтарам казак, апавяданняў і вершаў, якія былі надрукаваны на яго старонках.

На юбілейнай палічцы прадстаўлены творы, адрасаваныя дзецям. Апавяданні, казкі, вершы ўвайшлі ў залаты фонд беларускай дзіцячай літаратуры.

У апавяданнях мастака слова “Малыя дрывасекі», “Тулягі”, “Пяць лыжак заціркі”, “На Каляды к сыну” і інш. асэнсоўваецца тэма дзяцінства, трагічныя карціны жыцця беларускай вёскі. “Велікодныя яйкі”, “Летапісцы”, “Малітва малога Габрусіка”, “Дзе канец свету?” – у гэтых апавяданнях паказваюцца вобразы здольных, таленавітых дзяцей, якія часта не маюць магчымасці і ўмоў для самарэалізацыі.

Вершы Змітрака Бядулі прадстаўлены пейзажнымі творамі “Сняжынкі”, “Вясной”, “Зімнік”, дзе распавядаецца пра поры года. Цікава будзе пазнаёміцца з вершамі пра дзіцячыя гульні, забавы і захапленні – “Мае забавы”, “Люцік”. У яго багатай літаратурнай спадчыне для дзяцей можам знайсці калыханку, песню “Дудачка”, лічылку “Сокал”.

І нарэшце любімы жанр для дзяцей – гэта казка! Цікавыя і павучальныя творы асуджаюць гультайства і ўхваляюць жыватворную працу, распавядаюць пра шчырае сяброўства, супольнасць і згуртаванасць. На юбілейнай палічцы Змітрака Бядулі і ў бібліятэцы вы заўсёды зможаце знайсці казкі “Панская хвароба”, “Скарб”, “Іванка-прасцячок”, “Музыка”, “Мурашка Палашка” і інш.

Жадаем прыемнага знаёмства з дзіцячай кнігай выдатнага мастака слова Змітрака Бядулі!

V. Работа па прымяненні ведаў на практыцы і выпрацоўцы ўменняў і навыкаў. (*Слайд 36*)

1. “Двайны дзённік”. (Навучэнцы запаўняюць самастойна.)

	Апавяданне “Бондар”
Час напісання твора	У 1920 у газеце «Беларусь», якая выходзіла ў Мінску пад псеўданімам Ясакар
Тэматыка	Тэма мастака і мастацтва
Праблема	Праблема непаразумення паміж бондарам і вяскоўцамі, класавай нероўнасці; праблема недаацэненага таленту мастака пані; адказнасці чалавека за свае ўчынкі
Ідэя	Праца ў залатых руках таленавітага чалавека – гэта сапраўднае мастацтва. Умельства трэба перадаваць іншым людзям
Назва	“Бондар”
Жанр, пафас	Апавяданне. Трагічны
Асаблівасці кампазіцыі і сюжэта	5 кампазіцыйных частак
Героі твора	Даніла, Аўдоцця, суседзі
Мастацкія сродкі, мова твора	Эпітэты, мастацкія дэталі. Мова твора ўзорная, літаратурная. Наяўнасць устойлівых выразаў “залатыя рукі”, “жыў прыпяваючы”, “памятаць, як свае пяць пальцаў”

Асабістыя адносіны да мастацкага твора	Мастацкі твор прымусіў задумацца над тым, што вельмі важна не заставацца абыякавымі да людзей, што знаходзяцца побач. Талент, багацце душы майстра абавязкова трэба ацэньваць, заахвочваць. А ўмельцу трэба дзяліцца сваімі здабыткамі, перадаваць назапашаны вопыт, каб талент майстра знайшоў працяг у яго вучнях

2. Тэставы кантроль (анлайн) у сэрвісе Kahoot! (дадатак 5).

VI. Падвядзенне вынікаў вучэбнага занятку.

У мастацкім творы “Бондар” Змітрок Бядуля паказаў, што ўнутраны свет таленавітага чалавека вельмі складаны, адметны, багаты, далікатны, лёгкаранімы. Мастак не выносіць грубага ўмяшання ў гэты свет. Для творчасці яму патрэбны маральная падтрымка і спрыяльныя сацыяльныя ўмовы, ацэнка і прызнанне яго ўмельства. Гэта натхняе яго. Аднак нельга адоранаму чалавеку ганарліва замыкацца ў сваёй выключнасці. Умельства і багацце душы трэба перадаваць іншым. Мастак павінен … (*Слайд 37*)

Сфармулюйце, калі ласка, тэзісы, якія дапамогуць вырашыць праблемы, якія закранае аўтар у мастацкім творы (дадатак 6).

VII. Рэфлексія.

Скласці сінквейн. (*Слайд 38*)

Бондар
Далікатны, таленавіты.
Хвалюецца, стварае, верыць.
Не перадае багацце душы і ўмельства рук.
Мастак.

VIII. Дамашняе заданне.

Напішыце рэфлексіўнае эсэ “У чым шчасце і ў чым трагедыя героя апавядання Змітрака Бядулі “Бондар”?” (*Слайд 39*)

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

1. Беларускія пісьменнікі-юбіляры 2021 года [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу : https://www.calameo.com/read/006039769cc9fc689969b. Дата доступу : 15.05.2023.

2. Бядуля, З. Сярэбраная табакерка: Апавяданні, казка : Для малодш. шк. Узросту / З. Бядуля. Мінск : Юнацтва, 1997. С. 47–58.

3. Запрудский, Н.И. Современные школьные технологии : пособие / Н.И. Запрудский. 2-е изд. Мінск : Сэр-Вит, 2004. 288 с.

4. Навуменка, І.Я. Змітрок Бядуля / І.Я. Навуменка. Мінск : Беларуская навука, 2004. 227 с.

5. План-канспект урока беларускай мовы ў 5 класе // Pedportal.by [Электронны рэсурс]. Рэжым доступу : https://pedportal.by/assets/uploads/2c2bb4e310a4ea0b35-4b1b51e49bfb50/1608107511_1.docx. Дата доступу : 02.09.2021.

6. Сидоров, С.В. Возможности создания интерактивных модулей в обучающих приложениях LearningApps. Org / С.В. Сидоров // Сайт педагога-исследователя: Сидоров Сергей Владимирович [Электронный ресурс]. Режим доступа : http://si.sv.com/blog/2013-08-01-46. Дата доступа : 14.06.2020.

Международный научно-популярный журнал
Мастерство online
Docendo discimus
Обучая, учимся сами

№3 - 2023

Дадатак 1

Заданне 1. Адзначце на стужцы часу асноўныя падзеі жыцця і творчасці Змітрака Бядулі.



Международный научно-популярный журнал
Мастерство online
Docendo discimus
Обучая, учимся сами

№3 - 2023

Дадатак 2

Заданне 2. Знайдзіце асацыятыўную сувязь паміж наступнымі малюнкамі і расшыфруйце кросэнс.

Международный научно-популярный журнал
Мастерство online
Docendo discimus
Обучая, учимся сами
№3 - 2023

Дадатак 3

Заданне 3. Прааналізуйце галоўны вобраз-персанаж мастацкага твора Змітрака Бядулі “Бондар”.



Дадатак 4

Заданне 4. Патлумачце сувязі паміж гексамі ”Тэма мастака і мастацтва ў творах пісьменнікаў“. Па якім прынцыпе могуць быць аб’яднаны мастацкія творы?

Международный научно-популярный журнал
Мастерство online
Docendo discimus
Обучая, учимся сами
№3 - 2023

Дадатак 5

Заданне 5. Выканайце тэставы кантроль у сэрвісе «Kahoot!».



Международный научно-популярный журнал
Мастерство online
Docendo discimus
Обучая, учимся сами
№3 - 2023

Дадатак 6

Заданне 6. Сфармулюйце тэзісы, якія дапамогуць вырашыць праблемы, якія закранае аўтар у мастацкім творы.



Международный научно-популярный журнал
Мастерство online
Docendo discimus
Обучая, учимся сами

№3 - 2023



Международный
научно-популярный
журнал
Мастерство online

Docendo discimus
Обучая, учимся сами

№3 - 2023



Международный
научно-популярный
журнал
Мастерство online
Docendo discimus
Обучая, учимся сами

№3 - 2023